✓Нацыянальная бібліятэка Беларусі працягвае цыкл майстар-класаў з вядомымі народнымі майстрамі нашай краіны ў межах выставачнага праекта «Жывыя крыніцы», прымеркаванага да Года гістарычнай памяці. **14 красавіка** ў выставачным комплексе адбылася сустрэча з дыпламантам фестываляў і свят, сябрам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці Наталляй Гамаюнавай па вырабе аб'ёмнай цацкі **«Птушка»** ў тэхніцы «выцінанка». Адзін з відаў самабытнага народнага дэкаратыўна-ўжыткавага мастацтва – выцінанка – быў распаўсюджаны ў народным побыце ў канцы XIX – пачатку XX ст. Беларускія выцінанкі былі пераважна аднаколернымі, а іх малюнак за-

лежаў ад прызначэння вырабу, фантазіі, умення аўтара і ад рэгіёну, у якім ён ствараўся. Сучасная беларуская выцінанка вызначаецца багатай тэматыкай, разнастайнай тэхнікай выканання, арыгінальнымі дызайнерскімі рашэннямі, але заўсёды пры гэтым арыентуецца на народныя традыцыйныя матывы. На майстар-класе наведвальнікі змаглі зрабіць аб'ёмны вобраз птушкі-жаўрука. Ён адным з першых прылятаў з выраю, лічыўся вестуном вясны і любімым народным вобразам узнёслай душы. Такія абярэгі нашы продкі вешалі на дрэвы напярэдадні старажытнага свята «Гуканне вясны».